# *§ 10–0. Напалеонаўскія войны і Беларусь

«ПЛАН АГІНСКАГА» АЎТАНОМІЯ
НАПАЛЕОН БАНАПАРТ
ПЁТР БАГРАЦІЁН ЯКАЎ КУЛЬНЕЎ
МІХАІЛ КУТУЗАЎ
БАРАДЗІНО БЕРАЗІНА
БАБРУЙСКАЯ КРЭПАСЦЬ
ВЕНСКАЯ СІСТЭМА
СВЯШЧЭННЫ САЮЗ ПЕРШАЯ ІМПЕРЫЯ

Абарончыя войны рэспубліканскай Францыі

**1. Напалеонаўскія войны: перыядызацыя, прычыны, характар.** Рэвалюцыйныя падзеі канца XVIII ст. у Францыі пазбавілі спакою еўрапейскія манархіі, якія небеспадстаўна апасаліся распаўсюджвання прынцыпаў рэспубліканскага ўладкавання і пераўтварэнняў грамадства на сваёй тэрыторыі. У аслабленні Францыі, у тым ліку і ў калоніях, была зацікаўлена даўняя яе суперніца — Вялікабрытанія. Менавіта дзякуючы англійскай фінансавай падтрымцы ствараліся антыфранцузскія кааліцыі, асноўныя войскі для якіх пастаўлялі германскія дзяржавы.

Рэспубліканская Францыя здолела адбіць замежную інтэрвенцыю і, больш за тое, перайшла ў наступ. Дзякуючы ўвядзенню ўсеагульнай воінскай павіннасці ў Францыі была створана магутная армія, што колькасцю не саступала войскам еўрапейскіх кааліцый, а матываванасцю і маральным духам безумоўна іх пераўзыходзіла. Узначальвалі французскія войскі таленавітыя і ініцыятыўныя генералы і афіцэры, якія занялі свае месца дзякуючы не

паходжанню, а асабістым здольнасцям. Адным з такіх военачальнікаў быў карсіканскі дваранін Напалеон Банапарт, які напачатку сваёй кар'еры зрабіў важныя паслугі рэспубліканскаму ўраду — у 1793 г. завяршыў асаду Тулона, які ўтрымлівалі англічане і раялісты (французы — прыхільнікі манархіі), і падавіў контррэвалюцыйны мяцеж у сталіцы ў 1795 г. Ва ўсіх выпадках Напалеон умела выкарыстоўваў артылерыю, што ляжа ў аснову яго поспехаў у наступных войнах.

**Напалеон Банапарт**

**Францыя пачынае захопніцкія войны**

Вайна рэвалюцыйнай Францыі супраць іншаземных інтэрвентаў першапачаткова насіла справядлівы абарончы характар. Аднак ад 1794 г. французы перайшлі ў наступ, і вайна з іх боку ператварылася ў захопніцкую. На суседніх з Францыяй тэрыторыях — Аўстрыйскіх Нідэрландаў (Бельгіі), Галандыі, прырэйнскіх германскіх дзяржаў, Паўночнай Італіі, Швейцарыі — былі створаны «даччыныя» рэспублікі. Прагрэсіўнае значэнне мела знішчэнне ў іх ранейшых феадальных парадкаў. Але, з іншага боку, гэтыя тэрыторыі сістэматычна рабаваліся, у інтарэсах французскіх прамыслоўцаў абмяжоўвалася мясцовая вытворчасць.



*Банапарт перад сфінксам. Мастак Жэром Жан-Леон*

Які паход арміі Напалеона натхніў жывапісца? Якія асацыяцыі выклікае гэтая карціна ў вас?

З прыходам да ўлады Напалеона (1799 г.) маштабы французскіх заваёў у Еўропе яшчэ больш пашырыліся. У выніку серыі бліскучых перамог геніяльны палкаводзец здолеў нанесці паразу кааліцыям наймацнейшых еўрапейскіх дзяржаў. Былі значна пашыраны межы самой Францыі, многія дзяржавы апынуліся пад французскім пратэктаратам. Так да ранейшых прычын войнаў у Еўропе канца XVIII — пачатку XIX ст. дадаліся асабістыя амбіцыі Напалеона, які імкнуўся да панавання Францыі ў Еўропе і ўмацавання сваёй уласнай улады.

**Францыя робіцца імперыяй**

У 1804 г. Напалеон Банапарт прыняў тытул імператара. Францыя рабілася імперыяй, але гэта не цягнула за сабой аднаўлення старой манархіі.

### ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

У Канстытуцыі французскай імперыі, прынятай у 1804 г., адзначалася: «Кіраванне рэспублікай даручаецца імператару, які атрымоўвае тытул імператара французаў». Пры гэтым каралі Францыі насілі тытул «Кароль Францыі».

*Паразважайце, у чым сэнс тытула французскага імператара. Чаму ён адрозніваецца ад ранейшага тытула французскіх манархаў?*

Апорай новага дзяржаўнага ладу зрабіліся тыя колы насельніцтва, якія атрымалі перамогу ў выніку рэвалюцыі. Так, умацавала становішча французская буржуазія, у інтарэсах якой дзяржава праводзіла пратэкцыяністцкую палітыку. Сяляне атрымалі ва ўласнасць зямлю і былі гатовыя адстойваць гэтую заваёву любой цаной. Да таго ж удзел у ваенных паходах мог прынесці багацце.

Якія перамены ў эканамічнай сферы спрыялі поспехам заваявальных войнаў Напалеона?

Захопніцкія войны Напалеона ляглі ў аснову поспехаў Францыі ва ўнутранай і знешняй палітыцы. На некаторы час яны згуртавалі французскае

грамадства вакол асобы імператара і забяспечылі міжнароднае прызнанне новага рэжыму. Але, каб захаваць уладу, Напалеон мусіў працягваць даказваць сваю ваенную перавагу. Між тым людскія і матэрыяльныя рэсурсы Францыі не былі бясконцыя.

**Змяненне палітычнай карты Еўропы**

**2. Перамены ў Еўропе.** Напалеонаўскія войны змянілі палітычную карту Еўропы. Адбылося таксама пераразмеркаванне калоній. І калі на еўрапейскім кантыненце першае дзесяцігоддзе XIX ст. безумоўна панавала Францыя, дык у астатнім свеце ўзмацніла свае пазіцыі «ўладарка мораў» Вялікабрытанія.

На зусім кароткі час у 1802 г. у Еўропе ўсталяваўся мір — Вялікабрытанія падпісала Ам’енскую дамову з Францыяй. Але пачынаючы з 1805 г. вой-

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Імператар Напалеон у сваім кабінеце ў Цюільры. Мастак Давід Жак-Луі*

**Напалеонаўскія войны**

1796–1797 гг. — Першы італьянскі паход.

1798–1799 гг. — Егіпецкая экспедыцыя.

1800 г. — Другая італьянская кампанія. Бітва пры Марэнга.

1805 г. — Трэцяя антыфранцузская кааліцыя. Бітва пры Аўстэрліцы.

1806–1807 гг. — Чацвёртая антыфранцузская кааліцыя. Цільзіцкі мір.

1808–1814 гг. — Пірэнейская вайна.

1808–1809 гг. — Пятая антыфранцузская кааліцыя.

1812 г. — Расійска-французская вайна, Айчынная вайна.

1813–1814 гг. — Шостая антыфранцузская кааліцыя.

1815 г. — «Сто дзён» Напалеона. Сёмая антыфранцузская кааліцыя. Бітва пры Ватэрлоа.

*Карыстаючыся дадатковымі крыніцамі інфармацыі, складзіце табліцу «Вынікі напалеонаўскіх войнаў», адлюструйце ў ёй вынікі ўсіх вышэйзгаданых ваенных кампаній. Зрабіце вывад наконт уплыву напалеонаўскіх войнаў на развіццё Еўропы напачатку XIX ст.*

„Ну што, князь, Генуя і Лука сталі не болей, як маёнткамі фаміліі Банапартэ“.

Леў Талстой, «Вайна і мір»



*Стальніца з партрэтамі Напалеона і членаў яго сям'і*

Паразважайце, з якой мэтай Напалеон Банапарт рабіў сваіх родзічаў манархамі еўрапейскіх дзяржаў.

ны не спыняліся на працягу 10 гадоў. Напалеон здолеў нанесці паразу ўсім сваім праціўнікам, толькі ўварванне ў Расію ў 1812 г. скончылася поўным правалам. Але за 5 гадоў да «рускага паходу» паміж Францыяй і Расіяй быў заключаны Цільзіцкі мір, паводле якога апошняя далучалася да кантынентальнай блакады (недапушчэння англійскіх тавараў у кантынентальную Еўропу). Спыніць гандаль з Вялікабрытаніяй былі прымушаны і іншыя еўрапейскія дзяржавы.

На трон шэрагу еўрапейскіх дзяржаў Напалеон пасадзіў сваіх родзічаў і маршалаў. Такі палітычны парадак нагадваў старажытную феадальную традыцыю «пажалавання» зямель сваім васалам. Нават іспанскі кароль быў вераломна схоплены ў 1808 г. і на яго месца пасланы старэйшы брат Напалеона Жазэф (да гэтага — неапалітанскі кароль). У выніку ў Іспаніі палыхнула паўстанне, якое прыняло форму народнага супраціўлення — герылы.

## Пераўтварэнні ў зваяваных краінах

Напалеон змяняў межы еўрапейскіх дзяржаў, як хацеў. Ствараліся і новыя дзяржавы. Так, з польскіх зямель, якія належалі Прускаму каралеўству, было складзена Вялікае Герцагства Варшаўскае (1807–1815). Французскі імператар груба мяшаўся ва ўнутраныя справы заваяваных краін, хоць



„Згарніце гэтую карту, у наступныя дзесяць гадоў яна не спатрэбіцца“ (1806 г.).

Уільям Піт Малодшы,
прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі
(1783–1801 гг., 1804–1806 гг.)

рэформы, што ў іх праводзіліся, спрыялі пераадоленню феадальных перажыткаў — скасоўваліся прыгоннае права, саслоўныя прывілеі; зацвярджаліся законы, што баранілі правы прыватных уласнікаў; уводзіліся канстытуцыі. Але гэтыя пераўтварэнні суправаджаліся эканамічнай і культурнай экспансіяй Францыі. У падуладных яму краінах Напалеон спрабаваў надаць французскай мове статус афіцыйнай.

**Францыя і Расія. Падрыхтоўка да вайны**

**3. Айчынная вайна 1812 г. Беларусь у Айчыннай вайне 1812 г.** На шляху планаў поўнага панавання Напалеона ў кантынентальнай Еўропе да 1812 г. заставалася толькі Расія. Нягледзячы на фармальна саюзніцкія адносіны, Расія не падпарадкоўвалася патрабаванням Францыі выконваць умовы кантынентальнай блакады, парваць адносіны з Вялікабрытаніяй, даць ваенную дапамогу. Насцярожана ў Расіі было ўспрынята стварэнне польскай дзяржавы.

Непазбежнасць вайны паміж Францыяй і Расіяй разумелі абодва бакі, у сувязі з чым загадзя пачалася падрыхтоўка да яе. Праціўнікі шукалі саюзнікаў. Для Францыі такімі зрабіліся падпарадкаваныя і разгромленыя ёю дзяржавы, у тым ліку Прусія і Аўстрыя. Буйным поспехам расійскай дыпламатыі было заключэнне саюзных дамоў з Вялікабрытаніяй, Іспаніяй і Швецыяй. Напярэдадні вайны 1812 г. Расія паспела скончыць працяглую вайну з Асманскай імперыяй (1806–1812 гг.).

Да будучага сутыкнення праціўнікі дзейна рыхтаваліся і ў ваенных адносінах. Францыя засярodзіла каля меж Расіі больш чым 600-тысячную армію «двунадзесяці языкоў». Меркавалася, што асноўным тэатрам будучых ваенных дзеянняў будзе тэрыторыя Беларусі, менавіта таму расійскія ўлады зрабілі шэраг захадаў па яе ўмацаванні. Былі пабудаваны крапасныя збудаванні ў Бабруйску і Дынабургу, ваенны лагер каля Дрысы і масты цераз Бярэзіну каля Барысава. Для іх будавання актыўна прыцягвалася мясцовае насельніцтва. Так, толькі ў будоўлі Дрысенскага ваеннага лагера штогод удзельнічала каля 2500 чалавек.

Падумайце, што значыць выраз «двунадзесяць языкоў».



*Бабруйская крэпасць. XIX ст.*

На захадзе Беларусі была цалкам змешчана 2-я расійская армія (камандуючы — П. І. Баграціён) і часткова 1-я расійская армія (камандуючы — М. Б. Барклай дэ Толі). У асноўным іх забеспячэнне цяжкім гнётам легла на плечы беларускіх сялян. Рэкруты з пяці беларускіх губерняў істотна — на некалькі дзясяткаў тысяч — папоўнілі рэгулярныя расійскія войскі.

### Стаўленне насельніцтва беларускіх губерняў да будучай вайны

Між тым частка насельніцтва беларускіх губерняў (былое шляхецкае саслоўе ВКЛ) ставілася да маючай адбыцца расійска-французскай вайны неаднaзначна. З аднаго боку, былыя шляхціцы, мяшчане, разначынцы звязвалі з імем Напалеона магчымае адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта ў сувязі з гэтым частка мясцовай дваранскай моладзі паспяшалася пераехаць у створанае Напалеонам Герцагства Варшаўскае, дзе паступіла на службу ў польскае войска. Пазней яно прыме ўдзел у вайне з Расіяй.

З іншага боку, дваране-землеўладальнікі насцярожана глядзелі на сацыяльныя рэформы, якія праводзіліся па патрабаванні Напалеона, перш за ўсё на адмену прыгоннага права. Да таго ж, імкнучыся забяспечыць падтрымку насельніцтва нядаўна набытых тэрыторый, расійскі імператар Аляксандр I

значна паменшыў ім падаткі. Вядомыя таксама яго выказванні ў падтрымку аднаўлення цэласнасці і культурнай аўтаноміі краю.

**Айчынная вайна 1812 г.**

Айчынная вайна 1812 г. была цяжкім выпрабаваннем для Расіі. Нягледзячы на першапачатковую колькасную перавагу французскай арміі, яе выдатную вывучку і ўзбраенне, палкаводчыя таленты самога Напалеона і яго маршалаў, расійскія войскі здолелі перайсці ў контрнаступ. Нікчэмныя рэшткі яшчэ нядаўна непераможнай арміі пакінулі межы Расійскай імперыі напрыканцы 1812 г.

> Слова «Беразіна» дасюль захавалася ў французскай мове як абазначэнне поўнага правалу.

Падчас адступлення напалеонаўскія войскі зноў прайшлі па беларускіх землях. Канчатковая параза французам была нанесеная каля в. Студзенка блізу Барысава падчас пераправы цераз Бярэзіну (14–17 лістапада 1812 г.). На шляху руху захопнікаў і ў этнічна расійскіх, і ў беларускіх губернях узніклі партызанскія атрады. Са зброяй у руках выступілі жыхары вёсак Стараселле, Мажаны, Есьманы і Клеўкі ў Барысаўскім павеце, Варонкі ў Дрысенскім павеце і Жарцы ў Полацкім павеце. Такая актыўнасць насельніцтва ў барацьбе з захопнікамі была нечаканая нават для расійскіх улад.

**Вынікі вайны**

**4. Наступствы напалеонаўскіх войнаў.** Айчынная вайна 1812 г. значна ўзняла аўтарытэт Расіі на міжнароднай арэне. Але слаўная перамога каштавала велізарных ахвяр — і людскіх, і матэрыяльных. Многія гарады былі цалкам разбураны і спалены захопнікамі, у іх ліку беларускія Полацк, Кобрын, Барысаў. Моцна пацярпелі таксама Гродна, Мінск, Віцебск, Магілёў, Орша, Слонім і інш. Вельмі значна скарацілася колькасць насельніцтва. Так, у Мінску ў 1811 г. налічвалася 11 200 жыхароў, а ў канцы 1812 г. — толькі 3480; у Віцебску з 6708 мужчын засталося толькі 2415. У поўны заняпад прыйшла сельская гаспадарка Беларусі: адзначаўся падзеж жывёлы, напалову скараціліся пасеўныя плошчы. Негатыўныя наступствы вайны

будуць адбівацца ў Беларусі яшчэ не адно дзесяцігоддзе.

Параза ў Расіі была крахам спадзяванняў на сусветнае панаванне і асабіста для Напалеона. Нягледзячы на некалькі перамог у наступных кампаніях 1813–1814 гг., французскі імператар пазбавіўся ўлады. Не мела поспеху і яго спроба аднавіць сваю ўладу хаця б у Францыі падчас «Ста дзён» Напалеона (1815 г.).

**5. Венская сістэма міжнародных адносін і асноўныя прынцыпы яе фарміравання.** У верасні 1814 — чэрвені 1815 г. у сталіцы Аўстрыйскай імперыі — Вене — адбыўся кангрэс прадстаўнікоў еўрапейскіх дзяржаў. Прынятыя на ім рашэнні, а таксама заключаныя восенню 1815 г. дамовы ляглі ў аснову новай сістэмы міжнародных адносін. Аднак закладзеныя ў Венскай сістэме прынцыпы нельга назваць новымі, да таго ж яны насілі кансерватыўны і рэакцыйна-ахоўны характар. Асноўным быў прызнаны традыцыйны для еўрапейскай сістэмы міжнародных адносін яшчэ ад XVII ст. прынцып «раўнавагі сіл». Пры гэтым найважнейшую задачу лідары еўрапейскіх краін бачылі ў кансервацыі (г. зн. захаванні) палітычных рэжымаў і дзяржаўных меж, якія склаліся ў Еўропе пасля разгрому Напалеона.

Венскі кангрэс

**Венская сістэма міжнародных адносін** — сістэма міжнародных адносін, што склалася ў Еўропе пасля Напалеонаўскіх войнаў і існавала ад 1815 г.

Неўзабаве пасля заканчэння Венскага кангрэса ў верасні 1815 г. з ініцыятывы расійскага імператара Аляксандра I у Парыжы быў падпісаны «Акт Свяшчэннага саюзу». Першапачаткова ў Свяшчэнны саюз увайшлі Расія, Аўстрыя і Прусія, затым далучыліся амаль усе еўрапейскія дзяржавы, акрамя Вялікабрытаніі і Турцыі. Удзельнікі Свяшчэннага саюзу давалі абяцанне «ва ўсякім выпадку і ва ўсякім месцы... падаваць адно аднаму дапамогу, падмацаванне і падтрымку» з мэтай захавання меж, усталяваных Венскім кангрэсам, і падаўлення ўсякіх праяў «рэвалюцыйнага духу».

«Свяшчэнны саюз»



*Свяшчэнны саюз. Малюнак пачатку XIX ст.*

Менавіта ў падаўленні рэвалюцый у шэрагу еўрапейскіх дзяржаў (Неапалітанскім каралеўстве, Іспаніі і Партугаліі) Свяшчэнны саюз аказаўся найбольш эфектыўны. Аднак нацыянальна-вызваленчая вайна ў Лацінскай Амерыцы і грэчаскае паўстанне супраць асманскага прыгнёту прывялі да росту супярэчнасцей паміж дзяржавамі Еўрапейскага саюза і Вялікабрытаніяй. Між тым у цэлым Венская сістэма спрыяла таму, што Еўропа змагла пазбегнуць буйных міждзяржаўных канфліктаў аж да Крымскай, а пасля Першай сусветнай войнаў.

*Эпоха напалеонаўскіх войнаў — адна з найбольш яскравых старонак еўрапейскай гісторыі. Напалеонаўскае новае ўладкаванне Еўропы было першай рэальнай спробай усталяваць палітычнае адзінства Захаду, хоць яно не было вынікам свабоднага выбару еўрапейскіх краін і іх насельніцтва, а ўтрымлівалася французскай зброяй. Заваёвы Напалеона закранулі і беларускія землі, пакінуўшы адно спустошаныя гарады і вёскі.*

**калі ў свеце...**

1804 г. — Напалеон Банапарт абвешчаны «імператарам французаў»

**на тэрыторыі Беларусі...**

1804 г. — завершана будаўніцтва Агінскага канала, які злучыў водныя сістэмы рэк Нёмана і Дняпра

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Назавіце прычыны і вызначыце характар Напалеонаўскіх войнаў. Паразважайце, ці былі Напалеонаўскія войны даброўм або бедствам для Францыі і французскага народа.
2. Як змянілася палітычная карта Еўропы ў перыяд Напалеонаўскіх войнаў? Ахарактарызуйце прычыны і наступствы пераўтварэнняў, якія праводзіў Напалеон у заваяваных краінах.
3. Параўнайце стаўленне розных колаў насельніцтва ВКЛ да вайны 1812 г. Растлумачце, чым яно было абумоўлена.
4. Ацаніце наступствы Айчыннай вайны 1812 г.
5. Ахарактарызуйце Венскую сістэму міжнародных адносін, мэты стварэння і ўплыў на еўрапейскую палітыку Свяшчэннага саюза.